*Аляксандр Коласаў*

## АРХЕАЛАГІЧНЫЯ РАЗВЕДКІ 2003 Г. Ў АСІПОВІЦКІМ, МСЦІСЛАЎСКІМ І ЧЭРЫКАЎСКІМ РАЁНАХ МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Летам 2003 г. археалагічны атрад Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. Куляшова, пад кіраўніцтвам аўтара артыкула, правёў даследаванні археалагічных помнікаў на тэрыторыі Асіповіцкага, Мсціслаўскага і Чэрыкаўскага раёнаў Магілёўскай вобл. (падстава — Дазвол Інстытута гісторыі НАН Беларусі па форме № 2 (№ 1461). У выніку работ на тэрыторыях адзначаных раёнаў было вывучана 153 помніка, з іх 33 з'яўляюцца новымі, раней невядомымі ў навуцы.

Вывучэнне помнікаў археалогіі Асіповіцкага раёна было пачата ў 2002 г., калі археалагічным атрадам пад кіраўніцтвам В. Ф. Капыціна былі праведзены работы ў паўночнай, усходняй і паўднёва-ўсходняй частках раёна. У 2003 г. разведкі былі працягнуты аўтарам артыкула, у выніку якіх былі даследаваны помнікі басейна Асіповіцкага водасховішча, заходняй і паўднёвай часткі раёна і адзначана 77 археалагічных помнікаў, сярод якіх 12 з'яўляюцца новымі: стаянка каменнага веку ля в. Амінавічы, два селішчы эпохі феадалізму Амінавічы і Зборск, два адзіночных кургана ля вв. Малая Гарожа і Смык, пяць курганных могільнікаў (Вялікая Грава (14 насыпаў), Ігнатаўка (2 насыпы), Смык (2 насыпы), Ясянец-1 і 2 (5 і 2 насыпы) і дзве вугляпальных ямы. Сярод цікавых знаходак трэба адзначыць каменны крыж, які быў усталяваны на адным з курганоў могільніка Вялікая Грава.

На тэрыторыі Мсціслаўскага раёна разведкі ў 2003 г. былі сканцантраваны ў міжрэччы Сожа і Віхры, басейнах рр. Белая Натапа і Чорная Натапа. У выніку было вывучана 55 археалагічных помнікаў, з якіх 17 — адкрыта пад час экспедыцыі.

Да правядзення нашых даследаванняў, у раёне не было вядома аніводнага помніка каменнага веку. Знаходкі прадуктаў расшчаплення і прыладаў працы, зробленых з крэмня, падцвердзілі існаванне паселішчаў гэтага часу ля вв. Каробчына, Малая Лешчанка, Мішні, Парадзіна.

Шматлікія матэрыялы атрыманы пры даследаванні селішчаў ранняга жалезнага веку і эпохі феадалізму. Сярод новых трэба ўказаць селішчы Белынец, Беразетня, Добрае, Каробчына, Куркаўшчына, Краснае-2, Людагошч, Малая Лешчанка, Мішні, Падлужжа, Парадзіна.

На гэтых неўмацаваных паселішчах былі знойдзены разнастайныя знаходкі, у асноўным гэта былі фрагменты ляпной (Людагошч) і ганчарнай керамікі, кавалкі кафлі (Краснае-2), шкляныя і металічныя вырабы (напрыклад, спружынныя нажніцы былі знойдзены на паселішчы Парадзіна). Большасць фрагментаў пасудзін неарнаментаваныя. Некаторыя з іх упрыгожаны хвалістай (Белынец, Беразетня, Добрае, Куркаўшчына, Краснае-2), або гарызантальнай са спалучэннем з хвалістай (Добрае, Краснае, Падлужжа) лініямі.

Неад'емнай часткай археалагічнай спадчыны Мсціслаўскага раёна з'яўляюцца старажытныя славянскія пахаванні. У ліку новых трэба адзначыць адзіночны курган ля в. Лютня і курганны могільнік-2 ля в. Разанцы (36 насыпаў).

У Чэрыкаўскім раёне работы здзяйсняліся ў ваколіцах г. Чэрыкава і бліжэйшых да яго вёсак. У акрэсленых пунктах паўторна былі даследаваны вядомыя археалагічныя помнікі і адкрыты чатыры новыя.

Так, на першай надпоплаўнай тэрасе левага берага р. Сож, за 1,2 км на захад ад в. Гронаў была адкрыта стаянка-7 эпохі неаліту. Па краю тэрасы, на працягу 200 м, былі знойдзены шматлікія адшчэпы і пласціны, лістападобны наканечнік дроціка, наканечнік стралы трохвугольнай формы, адшчэпы з рэтушшу; абломкі ляпнога посуду рудога і шэра-рудога колеру, якія звонку загладжаны пучком травы, знутры — у асобных выпадках — расчосамі грэбня. Адзін з фрагментаў упрыгожаны адбіткамі грэбня.

Новае паселішча каменнага веку знойдзена на першай надпоплаўнай тэрасе правага берага старыцы р. Сож, на паўночна-ўсходняй ускраіне в. Мірагошч. Тут на працягу 100 м былі знойдзены прадукты расшчаплення крэмня, адшчэпы з рэтушшу і скрабок.

Новыя курганныя старажытнасці былі даследаваны ля вв. Гронаў і Горкі. Курганны могільнік Гронаў-2 налічвае два насыпы, якія размешчаны на полі, на адлегласці 10 м адзін ад аднаго. Курганы маюць паўсферычную форму, у плане акруглыя. Вышыня іх складае 1—2,4 м, дыяметр 6—18 м.

Курганны могільнік-2 ля в. Горкі налічвае 119 насыпаў паўсферычнай формы, у некаторых выпадках — формы «усечаны конус». Вышыня іх вагаецца ад 0,4 м да 2,5 м, дыяметр — 5—20 м. Нажаль, 96 насыпаў нарушаны скарбашукальніцкімі ямамі. У адным з такіх сапсаваных насыпаў траншэяпадобнай ямай аскрава прасочвалася сем напластаванняў з жоўтага пяску (таўшчынёю 0,10—0,15 м), якія перакрываліся праслойкамі зямлі цёмна-шэрага колеру (магутнасцю 2—3 см).

Такім чынам, археалагічныя работы 2003 г. дазволілі ўдакладніць звесткі пра помнікі археалогіі і дапоўніць крыніцазнаўчую базу па старажытнай гісторыі Асіповіцкага, Мсціслаўскага і Чэрыкаўскага раёнаў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова